# Ідуць экзамены!
# Студэнты БДУ, парадуем Радзіму высокімі ведамі!


Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя У. І. ЛЕНІНА

№ 21(530) Субота, 15 чэрвеня 1963 г. Цана 1 кап. Год выдання XVI-ы


## Весткі з экзаменаў

### Гістарычны факультэт

Студэнты трэцяга курса вячэрняга аддзялення гістарычнага факультэта здалі ўжо тры экзамены з чатырох, запланаваных на шосты семестр: гісторыю СССР, псіхалогію, замежную мову. Прастаўлены таксама адзнакі па курсавой рабоце па курсу гісторыі СССР. Лепшы вынік — 17 з магчымых 20 балаў — пакуль што маюць студэнты П. Бакановіч і В. Скрыпнічэнка. Усе чатыры добрых ацэнкі ў Б. Прыбыткоўскай, якая, дарэчы, значна лепей здае экзамены ў гэтую сесію.

На першым курсе па абодвух экзаменах — па гісторыі Камуністычнай партыі Савецкага Саюза (экзаменатар Ільля Паўлавіч Кожар) і па асновах археалогіі (экзаменатар Эдуард Міхайлавіч Загарульскі) — выдатныя ацэнкі мае толькі Н. Гук. Тры студэнты А. Дворак, В. Драгун і В. Шыбалка здалі першы экзамен на «добра», другі — на «выдатна».

### Матэматычны факультэт

Матэматыкі - вылічальнікі чацвёртага курса 5 і 6 чэрвеня здавалі экзамен па метадах вылічэнняў прафесару В. І. Крылову. З 48 студэнтаў 3 і 4 груп выдатныя адзнакі атрымалі 21, добрыя — таксама 21 і толькі шасці студэнтам прыйшлося задаволіцца «тройкамі». Сярод атрымаўшых выдатныя адзнакі —студэнты А. Букатаў, В. Уладзіміраў, М. Паварыч, К. Трапейка.

### Кубінскія студэнты

Дацэнт Н. Г. Круцько прымаў экзамен па гісторыі КПСС у трынаццаці кубінскіх студэнтаў, якія навучаюцца на першых курсах фізічнага і хімічнага факультэтаў нашага універсітэта. Выдатныя адзнакі атрымалі будучыя фізікі Карлас Мануэль Леакадыё Альварэс і Хуста Равела Трыяна і студэнт-хімік Эстэбан Луіс Альфонса Ольма. 9 «чацвёрак» і толькі адно «здавальняюча» — такі вынік у астатніх.

## Група садзеяння камісіі партыйна-дзяржаўнага кантролю БДУ імя У. І. Леніна

8 чэрвеня адбыўся агульнаўніверсітэцкі партыйны сход, на якім была выбрана група садзеяння камісіі партыйна-дзяржаўнага кантролю Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. У яе састаў увайшлі 17 чалавек:

ГАЛАЎКО Анатоль Аляксандравіч — дацэнт юрыдычнага факультэта,

ПРАКОШЫН Валерый Іванавіч — аспірант кафедры фізікі цвёрдага цела і паўправаднікоў,

ПАЎЛЕНКА Мікалай Андрэевіч — в. а. дацэнта філалагічнага факультэта,

СІТНІКАЎ Уладзімір Міхайлавіч—галоўны інжынер праблемнай лабараторыі,

ДУБОВІК Вадзім Іванавіч — в. а. дацэнта філалагічнага факультэта,

МАІСЕЕЎ Аляксандр Паўлавіч — начальнік аховы БДУ,

ЮЗЕФОВІЧ Міхаіл Іванавіч — вучэбны майстар майстэрні,

МЯДЗВЕДЗЕЎ Андрэй Рыгоравіч — прафесар геаграфічнага факультэта,

ЖАБЧЭНКА Іван Аляксандравіч — студэнт 3 курса юрыдычнага факультэта,

ГАМЕЗА Мікалай Васільевіч — студэнт 2 курса біялагічнага факультэта,

ІПАЦЬЕЎ Аляксандр Васільевіч — прафесар біялагічнага факультэта,

СЕВАСЦЬЯНАВА Людміла Ільінічна — асістэнт хімічнага факультэта,

ШАЛУДЗЬКО Адаліна Іванаўна — старшая лабарантка хімічнага факультэта,

ЧАПІНОГА Міна Мінавіч — загадчык кафедры матэматычнага факультэта,

АТРОШЧАНКА Віталій Данілавіч — студэнт 2 курса гістарычнага факультэта.

САМАЙЛОВІЧ Яўген Рыгоравіч — студэнт 3 курса геаграфічнага факультэта

САКОВІЧ Дзмітрый Мікалаевіч — студэнт 3 курса фізічнага факультэта.

## Першы ўступны

На ўсіх факультэтах універсітэта ідуць семестравыя, а ў выпускнікоў дзяржаўныя экзамены. Больш пяцісот маладых спецыялістаў здадуць апошнія экзамены, атрымаюць дыпломы. а з імі пуцёўкі ў жыццё. Апошні экзамен.. Зззаду пяць год напружанай працы, пошукаў, спрэчак. Але ні адзін студэнт не забудзе тых хвалюючых мінут, калі ён упершыню пераступіў парог універсітэта, калі ўзяў у рукі чыстыя аркушы паперы са штэмпелем Белдзяржуніверсітэта, каб здаць першы ўступны экзамен — напісаць сачыненне.

Іменна такія хвалюючыя мінуты перажываюць у гэтыя дні паступаючыя ва універсітэт на завочнае навучанне 11 чэрвеня абітурыенты пісалі сачыненне па рускай літаратуры. Гэта людзі, якія ўжо не адзін год працуюць на прамысловых прадпрыемствах, у школах і ва ўстановах.

Пяць год назад Анатоль Верамейчык скончыў сярэднюю школу, адслужыў у арміі, а пасля дэмабілізацыі набыў спецыяльнасць настройшчыка радыёапаратуры і працуе на радыёзаводзе. Юнак крыху хвалюецца, але ўпэўнены, што сачыненне напіша на станоўчую ацэнку.

Леаніда Іванаўна Багданава ўжо чатырнаццаць год працуе настаўніцай у пачатковых класах на Барысаўшчыне. Жанчына моцна палюбіла сваю прафесію і рашыла набыць вышэйшую адукацыю, каб выкладаць рускую мову і літаратуру ў сярэдняй школе.

Настаўнічаюць таксама ў розных раёнах рэспублікі Ніна Ільінічна Парфіновіч, Валянціна Аляксандраўна Радзіонава, а Галіна Злотнікава працуе ў Гомельскім абласным бібліятэчным калектары. Усе яны рашылі вучыцца без адрыву ад вытворчасці..

У аўдыторыю заходзяць экзаменатары Васіль Аляксандравіч Купрыенка і Мікалай Міхайлавіч Піпчанка. Наша размова з абітурыентамі перапыняецца. У зале ўстанаўліваецца цішыня. В. А. Купрыенка растлумачвае правілы правядзення экзаменаў, раздае кожнаму паступаючаму паперу са штэмпелем універсітэта. У аўдыторыю ўваходзіць дэкан філалагічнага факультэта прафесар Міхась Рыгоравіч Ларчанка. У яго руках таямнічы канверт. Ні ён, ні экзаменатары яшчэ не ведаюць тэмы сачынення.

— У гэтым канверце ваш лёс, — жартуе прафесар і разрывае канверт, чытае тэмы сачынення: — «Становішча прыгонных сялян па раману А. Н. Радзішчава «Падарожжа з Пецярбурга ў Маскву», «Кіруючая роля партыі ў сацыялістычным пераўтварэнні вёскі па раману М. А. Шолахава «Узнятая цаліна», «Народу рускаму заслоны не пастаўлены — перад ім шырокі шлях!» і «Калі імя табе камуніст».

Кожны паступаючы выбраў сабе тэму, пачаў пісаць. Першы ўступны экзамен пачаўся.

Ул. Баранаў.

ШТАБ ЦАЛІННІКАЎ БДУ ЗВЯРТАЕЦЦА ДА УСІХ СТУДЭНТАЎ, АСПІРАНТАЎ, СУПРАЦОЎНІКАЎ І ПРАФЕСАРСКА-ВЫКЛАДЧЫЦКАГА КАЛЕКТЫВУ З ПРОСЬБАЙ ПРЫНЯЦЬ УДЗЕЛ У ЗБОРЫ КНІГ І ПАДРУЧНІКАЎ ДЛЯ САЎГАСАЎ УРАЛЬСКАЙ ВОБЛАСЦІ.

КНІГІ ПРЫМАЮЦЬ КАМСОРГІ КУРСАЎ, ФАКУЛЬТЭТАЎ І КАМІТЭТ КАМСАМОЛА БДУ.

## *ПУЦЁЎКА Ў ТВОРЧАСЦЬ*

— Усе прачыталі артыкулы Аксёнава? — спытаў выкладчык Вадзім Іванавіч Дубовік.— Тады пачнем іх разбор...

У аўдыторыі ідуць практычныя заняткі па тэорыі і практыцы партыйна-савецкага друку ў студэнтаў 2 курса вячэрняга аддзялення журналістыкі. Тут сядзяць людзі, якія шмат кіламетраў прайшлі па цяжкіх дарогах жыцця. Некаторым з іх ужо за трыццаць. Рознымі шляхамі прыйшлі яны ў універсітэт на вячэрняе навучанне..

Аксёнаў чакае, ён падрыхтаваўся да горшага. Малавата ў яго яшчэ вопыту — толькі супрацоўніцтва ў заводскай шматтыражцы. Нікітка, Камбараў, Кулік, Холад, Перзашкевіч указваюць аўтару на недахопы, толькі крыху часу ўдзяляюць заўвагам аб дадатных якасцях артыкулаў.

Распальваюцца спрэчкі, але ў іх яшчэ не ўся знойдзена ісціна. Большасць студэнтаў упэўнена, што ў артыкулах Аксёнава не свеціць сонца ўдачы.

Нарэшце, слова — аўтару. Аксёнаў выступае няўпэўнена, у словах горыч захаваная. Прызнаецца, што артыкул «Крыніца» ён пісаў хутка, спяшаўся. Згаджаецца, што разбілі гэты артыкул зусім правільна. Аксёнаў гаворыць шмат, і калі ён закончыў, стала ясна, што падтрымка патрэбна чалавеку, што яму трэба дапамагчы хоць бы адным словам.

І хто, як не сябра, прыдзе на дапамогу першым, тым больш, што ён сядзіць побач з табою і глядзіць у вочы тваё адкрыта і чэсна. Але і Мыслівец заўважае недакладнасці і паказвае Аксёнаву, як адпрацаваць стыль, як правільна раскрыць тэму трэба было, як ідэю выказаць больш зразумела. І ад таго лягчэй на душы ў Аксёнава, хоць і думаў ён, што не скора яшчэ зможа выйсці на старонкі «вялікага друку».

Але пачаў падводзіць вынікі Вадзім Іванавіч Дубовік, і мы зразумелі, што правільна ў асноўным крытыкавалі аўтара ды прыдзіраліся да яго залішне ўжо. У дробязях усё разглядзелі, а ў вялікім нічога не ўбачылі. Забылі, што і ў творах масцітых журналістаў можна адшукаць чорную зярнятку на залатой ніве.

Здзіўляліся мы сваёй бястактнасці ў адносінах да Аксёнава, калі пачулі, што ў аўтара ёсць і свой стыль, і свая форма расказа, што штамп чужы яму, што шматтыражка стала для яго добрай школай і што, самае галоўнае, час ужо яму выходзіць на шырокую дарогу. І кожны з нас у душы пажадаў яму: «Шчаслівага табе шляху, Валька Аксёнаў!».

Л. МАРОЗАЎ,
студэнт вяч. адд. журналістыкі.

# Дзе ж новыя імёны?

Чатыры гады майстрам вытворчага навучання муляраў і мантажнікаў у Мінскім будаўнічым вучылішчы № 11 працуе Мікалай Паўлавіч Грабянцоў. Ён жа на грамадскіх асновах вядзе і лыжную секцыю. Сам Мікалай Паўлавіч — першаразраднік.

— Скажыце, дзе вы авалодалі спартыўным майстэрствам? — пацікавіўся я ў Грабянцова.

— Калі займаўся ў Мінскім індустрыяльна - педагагічным тэхнікуме прафадукацыі, — адказаў ён. — Многія мае таварышы сталі там спартсменамі. У павазе былі ў тэхнікуме спорт і фізічная культура. А цяпер бачыце, як гэта спатрэбілася ў маёй педагагічнай рабоце?

Побач са мной таксама жывуць будучыя педагогі. Гэта і ў педагагічным інстытуце імя Горкага, і ў інстытуце замежных моў, і ва універсітэце. А як тут выкладаецца фізкультура, рыхтуюцца спартсмены-разраднікі? Аб усіх ВНУ адразу меркаваць цяжка. Спынюся больш падрабязна на універсітэце, у якім вучуся.

Каля 500 педагогаў выходзіць штогод з універсітэта. А колькі ж з іх спартсменаў? Адзінкі. На першы погляд нават дзіўна, чаму гэта так. Тут жа працуе шмат выкладчыкаў фізічнай падрыхтоўкі з вышэйшай адукацыяй, амаль па ўсіх відах спорту створаны секцыі. Наш універсітэт займае трэцяе агульнакамандное месца сярод ВНУ рэспублікі. У нас вучацца вядомыя спартсмены: члены зборнай каманды краіны па лёгкай атлетыцы У. Гараеў, І. Бакуновіч, шмат спартсменаў, якія выступаюць за зборныя калектывы рэспублікі.

Але аб стане фізічнай культуры ў нас чамусьці мяркуюць па атрыманых перамогах, па колькасці падрыхтаваных разраднікаў. І часта забываюцца пра галоўнае — масавасць. Забываюцца, што трэба клапаціцца аб тым, каб усе студэнты займаліся фізкультурай і спортам.

Намаганні выкладчыкаў фізкультуры накіраваны на падрыхтоўку зборных каманд. Мы не раз бачылі, як сам загадчык кафедры Віктар Паўлавіч Шапялевіч па некалькі гадзін на тыдні трэніруе студэнтку другога курса Ларысу Кулік. Ларыса — майстар спорту па гімнастыцы. Майстрам яна прыйшла і ва універсітэт.

Праводзіцца першынство універсітэта па валейболу, баскетболу, ці іншаму віду спорту— і ў ліку ўдзельнікаў у факультэцкіх камандах мы сустракаем адных і тых жа спартсменаў — Г. Русака, А. Тарана, М. Васкрасенскага, Б. Бондарава і іншых. І гэта ўжо некалькі гадоў запар. А дзе ж новыя імёны? Іх няма.

Праўда, нядаўна адбыўся сенсацыйны выпадак: жаночая каманда фізікаў па баскетболу, якая лічылася чэмпіёнам універсітэта, раптам прайграла камандзе гісторыкаў.

— Малайцы, гісторыкі, выраслі! — радаваліся балельшчыкі.

Прызнацца, і я ўзрадаваўся поспеху маіх суседзяў. Але ўся радасць прапала, калі заўважыў у радах пераможцаў Н. Лойку, С. Жырухіну. Прабачце, гэта ж былыя спартакаўкі, выхаванцы трэнера Л. Шчукінай?! Значыць, атрыманай перамогай гісторыкі ў першую чаргу абавязаны Любові Львоўне Шчукінай, а не карпатлівай рабоце трэнераў універсітэта.

Асноўная маса студэнтаў як прыйшла з мінімальным запасам навыкаў па фізкультуры, з тым жа багажом вымушана і пакідаць універсітэт. І віна ў гэтым не толькі студэнтаў. Многія з іх любяць спорт, жадаюць займацца. Але секцыі перапоўнены ўжо добра зарэкамендаваўшымі сябе спартсменамі. І ўсе ж выхад з гэтага становішча пры жаданні можна было б знайсці. Варта было стварыць секцыі агульнафізічнай падрыхтоўкі па некалькіх відах спорту. Такія секцыі могуць працаваць на грамадскіх асновах. Па гэтаму пытанню я размаўляў неяк з сакратаром камітэта камсамола БДУ Георгіем Рылюком.

— А дзе мы возьмем трэнераў? — бездапаможна развёў ён рукамі.

А трэнераў гэтых ва універсітэце хоць адбаўляй. Чаму б, скажам, тым жа майстрам спорту, першаразраднікам не ўзначаліць секцыі? Хіба не магла тая ж Ларыса Кулік трэніраваць 10—15 сваіх сябровак? А Іван Бакуновіч, а Канстанцін Навумік? А іншыя вядомыя спартсмены універсітэта? Алімпійскія ж пераможцы, рэкардсмены свету і чэмпіёны краіны Тамара Прэс, Уладзімір Трусянёў, Анатоль Міхайлаў, Галіна Зыбіна шэфствуюць над школьнікамі, перадаюць ім свой вопыт.

Будучыя выхавацелі падрастаючага пакалення самі павінны быць усебакова развітыя, у тым ліку і фізічна. У справе выхавання будучых педагогаў не павінна быць ні дробязей, ні абыякавасці. Яны ж пойдуць у школы, будуць выхоўваць пакаленне, якому жыць і працаваць пры камунізме. І яны яшчэ ў студэнцкія гады павінны дбаць пра будучых выхаванцаў. А каб выхаваць іх працавітымі, дужымі, будучыя педагогі ў першую чаргу самі павінны стаць дужыя, моцныя, загартаваныя.

**Э. АЯДЗІНАЎ,**
**студэнт БДУ імя У. І. Леніна.**

*(З газеты «Звязда» ад 7 чэрвеня 1963 г.).*

## *З замежнага гумару*

НЕ ДАЙШЛО

Доктар пытае ў жанчыны:
— А як сёння адчувае сябе Ваш муж?
— Добра.
— Еў што-небудзь?
— Крупнік.
— З апетытам?
— Не, з морквaю.

ПРАГАВАРЫЎСЯ

**Студэнт** (па тэлефоне):
— Сэр, Джон Вільямс хворы і не зможа прыйсці на семінар.
— А хто гэта гаворыць?
— Гэта мой сусед па пакою.

*Ответы на чайнворд, опубликованный в № 20.*

*1. Университет. 2. Туризм. 3. Математик. 4. Клуб. 5. Буревестник. 6. Комсомолец. 7. Целинник. 8. Куратор. 9. Ректор. 10. Рейд. 11. Деканат. 12 Теорема. 13. «Архимед». 14. Диктант, 15. Теннис. 16. Стипендия. 17. Языковед. 18. Доказательство. 19. Общежитие.*

## Цікавыя факты

**Замест указкі**

Ад пастаяннага важдання з кіслотамі, шчолачамі і высокімі тэмпературамі рукі вучонага Бунзена сталі, як ён гаварыў, кіслотатрывалымі і вогнетрывалымі. Бунзен вельмі ганарыўся і любіў дэманстраваць гэта.

Растлумачваючы неяк будову і работу вынайдзенай ім гарэлкі, ён тыцнуў палец у полымя і не спяшаючыся прагаварыў:

— Вось у гэтай зоне, дзе зараз знаходзіцца мой палец, тэмпература складае прыкладна 300 градусаў.

**На усялякі выпадак**

Прыступаючы да вопытаў з хлорам, нямецкі хімік Эгон Віберг звярнуўся да студэнтаў з такімі словамі:

— Хлор, як вядома, ядавіты газ. Калі я страчу прытомнасць, прашу вынесці мяне на свежае паветра. Пасля гэтага вы можаце разыйсціся. На ўсякі выпадак напамінаю, што наступная лекцыя адбудзецца ў чацвер.

Рэдактар У. КУЛАЖАНКА.

## АБАРОНА ДЫСЕРТАЦЫЙ

18 чэрвеня 1963 года ў зале пасяджэнняў вучоных саветаў (ауд. 206) адбудзецца абарона дысертацый:

1. На атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук **Федзюковай Н. Ф.** на тэму **«Эпапея Сяргеева-Цэнскага «Пераўтварэнне Расіі»».**

2. На атрыманне вучонай ступені кандыдата філасофскіх навук **Рабковым І. А.** на тэму **«Барацьба В. Р. Бялінскага і А. І. Герцэна супраць ідэалізму славянафілаў (40-я гады XIX ст.)».**

Пачатак у 15 гадзін.

25 чэрвеня 1963 года у 15 гадзін, у зале пасяджэнняў вучоных саветаў адбудзецца абарона дысертацый на атрыманне вучонай ступені кандыдата біялагічных навук:

1. **Сюй Чэнь-мань** на тэму **«Атрыманне мутантаў у азімай пшаніцы пад дзеяннем хуткіх нейтронаў».**

2. **Лебедзевым В. М.** на тэму **«Электрафізіялагічныя даследаванні складанага адвольнага руху** (на прыкладзе штурхання ядра)».

З дысертацыямі можна азнаёміцца ў бібліятэцы універсітэта з 10 да 21 гадзіны, акрамя нядзелі.

# Беларускі дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна

## аб'яўляе прыём студэнтаў

**на наступныя факультэты дзённага і вячэрняга навучання у 1963—64 навучальным годзе:**

ГІСТАРЫЧНЫ; ФІЛАЛАГІЧНЫ па спецыяльнасцях: **беларуская мова і літаратура, руская мова і літаратура, журналістыка;** ЮРЫДЫЧНЫ; ФІЗІЧНЫ па спецыяльнасцях: **а) радыёфізіка і электроніка, б) фізіка;** МАТЭМАТЫЧНЫ; БІЯЛАГІЧНЫ; ГЕАГРАФІЧНЫ; ХІМІЧНЫ.

Ва універсітэт прымаюцца грамадзяне СССР абодвух полаў, якія маюць закончаную сярэднюю адукацыю: на дзённае навучанне — ва ўзросце да 35 гадоў, на вячэрняе навучанне—без абмежавання ўзросту, паспяхова здаўшыя ўступныя экзамены шляхам конкурснага адбору найбольш дастойных, падрыхтаваных і здольных людзей, што прадставілі станоўчыя характарыстыкі для паступлення ў ВНУ.

На спецыяльнасці журналістыка, правазнаўства прымаюцца толькі асобы, якія маюць стаж практычнай работы не менш як два гады.

Паступаючыя на дзённае навучанне падаюць дакументы з 20 чэрвеня па 31 ліпеня, уступныя экзамены — з 1 па 20 жніўня.

Паступаючыя на вячэрняе навучанне на ўсе спецыяльнасці, акрамя правазнаўства і журналістыкі, падаюць дакументы з 1 чэрвеня па 31 ліпеня, уступныя экзамены — з 1 па 20 жніўня.

Паступаючыя на вячэрняе аддзяленне па спецыяльнасцях правазнаўства, журналістыка падаюць заявы з 20 чэрвеня па 20 жніўня, уступныя экзамены — з 21 жніўня па 20 верасня.

Заява аб прыеме падаецца на імя рэктара універсітэта з указаннем выбранага факультэта і спецыяльнасці. Да заявы прыкладаюцца: аўтабіяграфія, характарыстыка для паступлення ў ВНУ, дакумент аб сярэдняй адукацыі (арыгінал), медыцынская даведка (форма № 286), 4 фотакарткі размерам 3x4 сантыметры (без галаўнога ўбора), даведка аб згодзе камандавання на прадастаўленне кароткатэрміновага водпуску для здачы экзаменаў (для ваеннаслужачых), выпіска з працоўнай кніжкі, засведчаная кіраўніком прадпрыемства або ўстановы (праўлення калгаса— для калгаснікаў).

Удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны дадаткова прадстаўляюць даведку райваенкамата, якая пацвярджае факт удзелу ў Вялікай Айчыннай вайне.

Асобы, якія скончылі сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы, разам з дыпломам абавязаны прадставіць прыкладанне да яго ўстаноўленага ўзору з указаннем ацэнак.

Паступаючыя на дзённае і вячэрняе навучанне універсітэта здаюць уступныя экзамены:

а) на філалагічны факультэт па спецыяльнасцях:

беларуская мова і літаратура — па беларускай мове і літаратуры (сачыненне і вусна), гісторыі СССР (вусна), замежнай мове (вусна),

руская мова і літаратура — па рускай мове і літаратуры (сачыненне і вусна), гісторыі СССР (вусна), замежнай мове (вусна),

журналістыка — па рускай мове і літаратуры (сачыненне і вусна) або па жаданню паступаючага па беларускай мове і літаратуры (сачыненне і вусна), гісторыі СССР (вусна), замежнай мове (вусна);

б) на гістарычны і юрыдычны факультэты — па рускай мове і літаратуры (сачыненне і вусна), гісторыі СССР (вусна), замежнай мове (вусна);

в) на фізічны і матэматычны факультэты — па рускай мове і літаратуры (сачыненне), матэматыцы (пісьмова і вусна), фізіцы і замежнай мове (вусна);

г) на біялагічны факультэт— па рускай мове і літаратуры (сачыненне), фізіцы, хіміі, замежнай мове (вусна);

д) на геаграфічны факультэт — па рускай мове і літаратуры (сачыненне), геаграфіі (вусна), матэматыцы (пісьмова і вусна), замежнай мове (вусна);

е) на хімічны факультэт — па рускай мове і літаратуры (сачыненне), хіміі, матэматыцы, фізіцы, замежнай мове (вусна).

Асобы, паступаючыя на вячэрняе навучанне, ад здачы экзамена па замежнай мове вызваляюцца, за выключэннем паступаючых па спецыяльнасцях: беларуская мова і літаратура, руская мова і літаратура, журналістыка.

Дакументы падаюцца па адрасу: **Мінск, Беларускі дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна, прыёмная камісія.**

Яўка на уступныя экзамены — па выкліку універсітэта.

**Адрас рэдакцыі:**
Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, 212. Тэл. 2-07-19.

Друкарня Белсаўпрофа.
АТ 10301. Тыр. 2000 Зак. 2208.